*Дз. М. Дубініна (Мінск)*

# САМАСТОЙНАЯ КІРУЕМАЯ ПРАЦА СТУДЭНТАЎ ПА ТЭОРЫІ І МЕТОДЫЦЫ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

Рэфармаванне сістэмы вышэйшай школы прадугледжвае фарміраванне спецыяліста новага тыпу. Пры гэтым будучы спецыяліст павінен атрымаць высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі як па асноўнай, так і па дадатковай спецыяльнасці.

На факультэце дашкольнай адукацыі БДПУ падрыхтоўка студэнтаў вядзецца па наступных спецыяльнасцях: «Дашкольная адукацыя. Выяўленчае мастацтва», «Дашкольная адукацыя. Замежная мова», «Дашкольная адукацыя. Музычнае мастацтва і харэаграфія», «Дашкольная адукацыя. Практычная псіхалогія», «Дашкольная адукацыя. Фізічная культура». Навучанне па ўсіх спецыяльнасцях накіравана на фарміраванне ў студэнтаў пэўнай маўленчай кампетэнцыі. Гэта тлумачыцца сацыяльнай значнасцю маўлення, яго роляй ў сістэме псіхічных функцый, у станаўленні і развіцці асобы. Галоўным кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў выступаюць прыкладныя аспекты навучання. Курс тэорыі і методыкі развіцця маўлення і навучання дашкольнікаў роднай мове з'яўляецца адным з асноўных ў гэтай падрыхтоўцы.

Методыка развіцця маўлення дашкольнікаў па сутнасці ўяўляе сабой інтэгратыўную дысцыпліну, якая разглядае лінгвістычныя, псіхафізіялагічныя, псіхалінгвістычныя і дыдактычныя асновы развіцця маўлення дзяцей. Прафесійная падрыхтоўка студэнтаў ўсіх спецыяльнасцей па гэтай дысцыпліне адбываецца на факталагічным, тэарэтычным і рэфлектыўным ўзроўнях. Яна ўключае засваенне тэорыі развіцця дзіцячага маўлення і авалодванне ўменнямі кіраваць працэсам развіцця маўлення і маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту. Вялікая ўвага надаецца пры гэтым асэнсаванню праблем, якія стаяць перад дысцыплінай, вывучэнню інавацыйнага вопыту працы па развіцці маўлення і імкненні ствараць свае арыгінальныя спосабы ўздзеяння на маўленне дзяцей. Такім чынам, паглыбляецца тэарэтыка-метадычная падрыхтоўка, якая адпавядае рэфлектыўнаму ўзроўню.

У сувязі з узрастаннем патрабаванняў да якасці вышэйшай адукацыі ў змест вучэбна-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў уводзіцца кіруемая самастойная работа, якая ажыццяўляецца па распрацаванай праграме і рэгламентуецца дэканатам.

На факультэце дашкольнай адукацыі падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па некалькіх спецыяльнасцях, таму да арганізацыі самастойнай кіруемай працы студэнтаў мы падыходзім дыферэнцыравана.

Кіруемая самастойная праца студэнтаў па тэорыі і методыцы развіцця маўлення дашкольнікаў уключана ў рабочыя праграмы. Пры яе распрацоўцы мы ўлічваем стандарты падрыхтоўкі студэнтаў па пэўнай спецыяльнасці. Разам з тым, змест самастойнай кіруемай работы студэнтаў вызначаецца намі з улікам заканамернасцей станаўлення прафесійна-асобасных пазіцый будучага педагога. Найбольш удалай формай арганізацыі самастойнай кіруемай працы студэнтаў, на нашу думку, з'яўляецца сістэма заданняў, прапанаваная І. І. Казімірскай, А.А. Торхавай. Гэтая сістэма ўключае заданні для самастойнай паза-

аўдыторнай работы, заданні для самаправеркі і самаацэнкі, заданні для паглыбленага вывучэння па свабодным выбары, якія могуць быць як індывідуальныя, так і мікрагрупавыя, а таксама літаратуру для самастойнай працы па тэме.

У курсе «Тэорыя і методыка развіцця маўлення дашкольнікаў» прадугледжана як рэпрадуктыўная (выкананне практыкаванняў з вучэбнай літаратурай, работа са слоўнікамі, праслухоўванне аўдыё– і прагляд відэаматэрыялаў), так і прадуктыўная, даследчыцкая, праца студэнтаў (распрацоўка фрагментаў лекцый, псіхалагічных, лінгвістычных кансультацый, выкананне творчых праектаў, падрыхтоўка да кантрольных работ, напісанне курсавых і дыпломных прац).

У сувязі з дыферэнцыраваным падыходам да самастойнай работы па тэорыі і методыцы развіцця маўлення дашкольнікаў у залежнасці ад спецыяльнасці студэнтам прапануецца розная тэматыка дыскусій, рэфератаў, эсэ, лабараторных работ, педагагічных праектаў і інш.

Прывядзем прыклад дыферэнцыравання самастойнай працы студэнтаў па тэме «Дзіцячае маўленне». Так, для студэнтаў, якія займаюцца па спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя. Практычная псіхалогія», прапануецца больш глыбокае вывучэнне і аналіз навуковых прац Л. С. Выготскага «Мышление и речь», С. Н. Карпава, І. Н. Колабава «Особенности ориентировки на слово у детей» , напісанне рэфератаў па тэмах «Тэорыі фарміравання маўленчай свядомасці ў антагенезе», «Дзіцячая словатворчасць, яе віды і тыпы. Механізмы і прынцыпы гэтай з'явы (паводле К. І. Чукоўскага, Т. М. Ушаковай і інш.)». Для спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя. Фізічная культура» – разгляд навуковых прац М. М. Кальцова «Двигательная активность и развитие функций мозга ребенка», М. І. Краснагорскі «Речевые рефлексы у детей», напісанне рэфератаў «Маўленчыя памылкі і іх папярэджванне», «Жэставае маўленне дзіцяці». Для спецыяльнасцей «Дащкольная адукацыя. Выяўленчае мастацтва» і «Дашкольная адукацыя. Музычнае мастацтва і харэаграфія» – вывучэнне навуковых прац А. М. Гваздзёва «Вопросы изучения детской речи», М. М. Кальцова «Ребенок учится говорить», напісанне рэфератаў «Фактары маўленчага развіцця чалавека», «Антагенез маўленчай камунікацыі».

Заданні для самастойнай працы студэнтаў падбіраюцца з улікам іх спецыяльнасці. У адпаведнасці з тэмамі вызначаюцца як абавязковыя для ўсіх заданні, так і заданні для паглыбленага вывучэння матэрыялу. Па змесце і спосабах выканання гэтыя заданні маюць варыятыўны характар, што забяспечвае студэнтам свабоду выбару.

Выніковы кантроль засваення студэнтамі матэрыялу ажыццяўляецца ў спецыяльна адведзены час у выглядзе тэсціравання, педагагічнага дыктанта, кантрольнай працы, калоквіуму.

Найбольш якасным падыходам да самастойнай кіруемай працы з'явілася яе ўключэнне ў модульна-рэйтынгавую сістэму навучання. Менавіта гэтая сістэма дазволіла актывізаваць матывы вучэбна-прафесійнай дзейнасці студэнтаў, рацыянальна арганізаваць іх працу на працягу навучальнага года, стварыць умовы для паслядоўнага станаўлення індывідуальнага стылю прафесійнай дзейнасці будучага педагога.

Такая сістэма арганізацыі працы дае магчымасць студэнтам атрымаць адукацыю ў межах выбранай прасторы прафесійнага развіцця з улікам сімптамакомплексу іх здольнасцей і індывідуальных магчымасцей.